УДК 373.3.161

***А.М. Дзямідава***
(ДУА «Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва»)

# ШЛЯХІ І СРОДКІ ЎЗБАГАЧЭННЯ СЛОЎНІКАВАГА ЗАПАСУ ВУЧНЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І Ў ПАЗАЎРОЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*У артыкуле прадстаўлены вопыт работы па ўзбагачэнню слоўнікавага запасу вучняў на ўроках беларускай мовы і ў пазаўрочнай дзейнасці праз гульнёвую дзейнасць, уключэнне школьнікаў у суразмоўніцтва, навучанне на аснове камунікатыўна-дзейнаснага падыходу. Прапанаваная сістэма развіцця вуснай мовы можа быць карыснай у дзейнасці настаўнікаў пачатковых класаў і выхавацелей груп падоўжанага дня.*

Цяжка пераацаніць унікальнае значэнне роднай мовы ў станаўленні чалавека. Інтэлектуальнае развіццё вучня, фарміраванне яго характару, эмоцый і асобы ў цэлым знаходзіцца ў непасрэднай залежнасці ад мовы. Малодшы школьны ўзрост з'яўляецца самым спрыяльным перыядам для актыўнага маўленчага развіцця. Я лічу, што навучыць разумець беларускую мову і ўключыць вучняў ў суразмоўніцтва можна, толькі акунуўшы іх у моўнае асяроддзе. Зрабіць гэта можна ва ўмовах арганізаванага навучання.

Мэта навучання беларускай мове – авалоданне навучэнцамі камунікатыўнымі ўменнямі і навыкамі, неабходнымі для эфектыўнага выкарыстання мовы ў розных сітуацыях зносін, развіццё іх творчага патэнцыялу, далучэнне праз мову да культурных традыцый беларускага народа [1].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Аднак навучанне беларускай мове, на мой погляд, сустракаецца з пэўнымі цяжкасцямі:

– невялікі слоўнікавы запас вучняў;

– узровень развіцця камунікатыўных навыкаў нізкі ў дзяцей, для якіх беларуская мова з'яўляецца роднай, і тым больш для тых, хто авалодвае гэтай мовай як другой у працэсе навучання;

– адсутнасць маўленчага асяроддзя і сацыяльнай неабходнасці ў выкарыстанні мовы.

Я лічу, што навучальны працэс трэба арганізоўваць так, каб задача развіцця мовы стала стрыжнёвай. Стараюся стварыць умовы для гаварэння кожнаму вучню. Упэўнена, чым болей будзе размаўляць дзіця, тым хутчэй яно навучыцца гаварыць па-беларуску.

Для ўзбагачэння слоўнікавага запасу вучняў я выбрала самыя прадуктыўныя, на мой погляд, методыкі: уключэнне школьнікаў у суразмоўніцтва, навучанне на аснове камунікатыўна-дзейнаснага падыходу, гульнёвую дзейнасць.

Сутнасць методыкі на аснове суразмоўніцтва ў наступным:

– навучанне мове арганізуецца не як засваенне гатовых ведаў, а як іх здабыча самімі дзецьмі ў працэсе пошукавай дзейнасці пад кіраўніцтвам настаўніка;

– навучанне роднай мове грунтуецца на суразмоўніцтве;

– навучанне мове арыентуецца на развіццё рознабаковых здольнасцей вучня ў працэсе практычнай дзейнасці;

– навучанне мове разглядаецца як сумесная творчая дзейнасць настаўніка і вучняў.

Настаўнік, вызначаючы сістэму працы па развіцці маўлення, павінен памятаць, што вучань ніколі не навучыцца выказваць свае думкі, уступаць у суразмоўніцтва, пакуль не будзе пастаўлены перад неабходнасцю дзейнічаць (гаварыць) ва ўмовах штучнага маўленчага асяроддзя – у працэсе школьнага навучання [2].

Камунікатыўна-дзейнасны падыход патрабуе ад настаўніка арыентавацца ў працы з вучнямі на віды маўленчай дзейнасці: чытанне, аўдзіраванне, гаварэнне. Ён адпавядае сучасным патрабаванням да адукацыі:

– агульная культура і эрудыцыя дзіцяці, здольнасць самастойна выкарыстоўваць і набываць веды, падрыхтаванасць жыць і правільна дзейнічаць у зменлівых жыццёвых сітуацыях;

– сфарміраванасць вядучай дзейнасці малодшага школьніка, наяўнасць такіх якасцей, як самастойнасць, ініцыятыўнасць, дзелавітасць, адказнасць.

Камунікатыўна-дзейнасны падыход у навучанні прадугледжвае супрацоўніцтва, у якім зацікаўлены як настаўнікі, так і школьнікі. Калектыўная навучальная, пераважна пошукавая дзейнасць спрыяюць фарміраванню пазнавальных матываў [3].

Практычную дзейнасць пачынаю з самых першых дзён першага класа. Выкарыстоўваю любы момант для ўзбагачэння слоўніка вучняў. Пачынаю з ранішніх сустрэч. З першых хвілін, у гульнёвай форме вучні ўключаюцца ў суразмоўніцтва. Тэм для ранішніх сустрэч шмат. Самыя любімыя дзецьмі – "Колеры вясёлкі", "Дні тыдня", "Месяцы", "Агароднiна", "Садавіна", "Свойскія жывёлы", "Дзікія жывёлы", "Птушкі", "Адзенне", "Абутак".

Самы цікавы і любімы дзецьмі метад – "Інтэрв'ю". Спачатку інтэрв'ю бяру я, а потым з задавальненнем – мае вучні. Самае галоўнае на данным этапе – апірацца на моўны вопыт дзяцей і пакрыху яго папаўняць.

Камунікатыўна-дзейнасны падыход пры папаўненні слоўнікавага запасу вучняў рэалізоўваю ў побыце, у працэсе азнаямлення з навакольным светам або ў розных відах дзейнасці. Напрыклад: тэматычную групу слоў "Посуд" можна вывучыць у школьнай сталоўцы, "Кветкі" – у час экскурсіі на школьны двор, а "Часткі цела" – на ўроку фізічнай культуры.

Выкарыстоўваю шмат дыдактычных гульняў: "Назаві адным словам", "Слова заблудзілася", "Будзь уважлівы", "Назаві тры прадметы", "Адзін-некалькі", "Адзін – многа", "Перакладчык", "Хто такі ці што такое?", "Які, якая, якое, якія?", "Скажы трэцяе слова", "Наадварот", "Скажы інакш". Яны дапамагаюць аднавіць і сістэматызаваць веды.

Я заводжу для вучняў памяткі з тэматычнымі групамі слоў. Яны змяшчаюць больш за 390 слоў і словазлучэнняў, якія к канцу першага класа ведаюць і ўжываюць мае вучні. Такім чынам, дзеці вучацца працаваць са слоўнікамі. Асобую ўвагу адводжу аўдзіраванню. Чытаю творы так, каб вучням было прыемна і цікава мяне слухаць. Пры чытанні пастаянна спыняюся, прашу суаднесці праслуханнае з малюнкавым радам або запомніць паслядоўнасць ў развіцці падзей. Слоўнікавую работу праводжу не перад чытаннем, а ў працэсе, у кантэксце, каб была хвілінка адкрыццяў. Лічу, што тое, да чаго вучні даходзяць самі, запамінаецца лепш. Вельмі цікавымі для вучняў з'яўляюцца заданні на вызначэнне дзеючых асоб, асэнсаванне іх учынкаў. Асобае значэнне маюць адказы на пытанне па прачытаным. Гэтыя заданні ўключаюць вучняў у дыялог або спрэчку, а значыць у суразмоўніцтва.

Трэба вучыць дзяцей працаваць не толькі індывідуальна, але і ў парах, ў групах і калектыўна. І ў гэтым мне дапамагаюць гульні: "Апрані ляльку", "Крама", "Дызайнер", "Вялікае мыццё", " Модны прыгавор".

Каб мова вучняў была прыгожай і мілагучнай, трэба ўзбагачаць яе прыметнікамі і дзеясловамі. Прапаную вучням наступныя заданні: складанне загадак-апісанняў, сінквейнаў, дыяфільмаў, маляванне вусных карцін, маляванне на слых.

З мэтай папулярызацыі беларускай мовы кожны чацвер у нашай школе – дзень беларускай мовы. У гэты дзень нават бацькі вучняў размаўляюць са мной і дзецьмі па-беларуску. На перапынках мы гуляем у беларускія гульні, развучваем вершы, чытаем беларускія творы. Мы звяртаемся да кутка беларускай мовы, дзе для вучняў вывешваю цікавыя заданні. Больш за ўсё дзеці любяць разгадваць анаграмы, рэбусы, красворды, філворды і параўноўваць рускія і беларускія тэксты.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Увядзенне на пачатковым этапе навучання беларускай мове факультатыўных заняткаў накіравана на развіццё моўных здольнасцей малодшых школьнікаў, пашырэнне сферы прымянення беларускай мовы і ўдасканаленне камунікатыўных уменняў і навыкаў. Гэтыя дапаможныя формы арганізацыі працэсу навучання малодшых школьнікаў беларускай мове прызначаны для задавальнення іх патрэбнасцей у роднай мове і імкненняў да моўнага самаўдасканалення. Тэмы і структура факультатыва "Роднае слова" прадуманы так, што мы з вучнямі аналізуем і вымаўляем беларускія гукі, вучым вершы, рыфмаванкі, лічылкі, скорагаворкі, прыказкі, прымаўкі, песні , знаёмімся з фразеалагізмамі.

Вялікую ролю адводжу фальклорным святам "Масленіца", "Калядкі", "Пасха".

Сучасныя даследванні вучоных даказваюць, што ў дзяцей маўленчыя цэнтры мозга часткова фарміруюцца пад уздзеяннем імпульсаў, якія паступаюць ад пальцаў рук [4].

Нашы непісьменныя, але мудрыя продкі прыдумалі шмат цікавых забаўлянак: "Сарока-варона", "Кую, кую ножку". Пальчыкі хочуць дзейнічаць, даследваць, запамінаць. Гэта цудоўны матэрыял для фізкультхвілінак і развіцця мовы вучняў.

Маімі вялікімі памочнікамі з'яўляюцца бацькі вучняў . Яны чытаюць дома дзецям творы прапанаваных мною беларускіх пісьменнікаў, глядзяць разам з дзецьмі "Калыханку" і беларускія фільмы.

Я ўпэўнена, што навучыць вучняў беларускай мове можна, калі арганізавана сістэмная праца і супрацоўніцтва паміж настаўнікам, вучнямі і бацькамі.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Учебные программы для III классов учреждений общего среднего образования с русским языком обучения. – Минск : НИО, 2017.
2. Яленскі, М.Г. Навучанне роднай мове на аснове суразмоўніцтва / М.Г. Яленскі // Пачатковая школа. – 2001. – № 7. – С. 11.
3. Какора, А.І. Прыёмы і формы ўзбагачэння слоўнікавага запасу малодшых школьнікаў / А.І. Какора // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. – 2003. – № 1. – С. 3–11.
4. Сторажава, Н.А. Мова мая і твая / Н.А. Сторажава. – Мінск, 1993. – 68 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова